С.М. Якуба, Мінск

# БЕЛАРУСКІЯ ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ Ў СІСТЭМЕ РАБОТЫ ПА РАЗВІЦЦІ АРФАГРАФІЧНЫХ УМЕННЯЎ І НАВЫКАЎ ВУЧНЯЎ

Тэкстацэнтрычны падыход пры навучанні беларускай мове не выключае магчымасці выкарыстоўваць у якасці дыдактычнага матэрыялу іншыя моўныя адзінкі, і ў першую чаргу – сказы. Засяроджваючыся на паняцці «поле арфаграмы», якое можа быць пададзена як дзвюма літарамі, так і цэлым тэкстам, вучоныя адзначаюць, што некаторыя арфаграфічныя правілы эфектыўна засвойваюцца толькі на ўзроўні сказа [1, с. 30]. Якраз сказ у якасці арфаграфічнага поля (па-за ўвагай не застаецца і арфаграфічнае поле слова, словазлучэння і інш.) мэтазгодна выкарыстоўваць падчас развіцця арфаграфічных уменняў і навыкаў пры засваенні такіх абагульняльных тэм, як "*Напісанне **не (ня), ні** з рознымі часцінамі мовы*". У сувязі з гэтым варта адзначыць, што беларускія прыказкі і прымаўкі, якія паводле будовы суадносяцца са сказамі розных тыпаў, дзякуючы сваёй лаканічнасці дазваляюць выкарыстоўваць іх у якасці дыдактычнага матэрыялу пры арганізацыі работы па развіцці арфаграфічных уменняў і навыкаў. Сістэма вобразаў, народная мудрасць, закладзеныя ў парэміях, даюць уяўленне пра культурна-нацыянальны вопыт беларускага народа і яго традыцыі, што, безумоўна, з'яўляецца асновай для фарміравання ўяўлення пра мову як нацыянальны феномен. Суразмоўніцтва па змесце прыказак, заданні творчага характару будуць садзейнічаць развіццю маўлення і вобразнага мыслення вучняў.

Перш чым пачынаць работу па развіцці арфаграфічных уменняў і навыкаў, варта вызначыць узровень падрыхтоўкі вучняў па тэме *"Напісанне **не (ня), ні** з рознымі часцінамі мовы*". Для вырашэння пастаўленай задачы прапануюцца разнастайныя дыягнастычныя практыкаванні. У якасці аднаго з іх можна прапанаваць тлумачальны дыктант на матэрыяле прыказак і прымавак.

Пасля дыягностыкі ведаў, уменняў і навыкаў арганізуецца работа па абагульненні і сістэматызацыі вывучанага матэрыялу, падчас якой асаблівая ўвага звяртаецца на аперацыйную дзейнасць вучняў. На гэтым этапе засваення ведаў прапануецца складанне алгарытмаў, якія дапамогуць вучням засяродзіцца на паслядоўнасці разумовых дзеянняў, неабходных для прымянення ведаў на практыцы, дадуць магчымасць прасачыць сувязь паміж асобнымі напісаннямі, убачыць сістэмнасць арфаграфіі. На думку вучоных, праца з алгарытмам будзе эфектыўнай толькі ў тым выпадку, калі настаўнік кантралюе разумовыя дзеянні вучняў, патрабуючы ад іх падрабязных разважанняў, "калі гэтыя дзеянні фіксуюцца, адзначаюцца (прагаворваюцца з выкарыстаннем узору прымянення правіла)" [2, с. 26].

Наступны этап работы па развіцці арфаграфічных уменняў і навыкаў – практыкаванні, заснаваныя на аналітыка-сінтэтычнай дзейнасці вучняў падчас выбару арфаграмы:

Прачытайце. Растлумачце сэнс прыказак і прымавак. Вызначце, якія арфаграмы найбольш часта сустракаюцца ў словах з прапанаваных сказаў. Назавіце правіла, якім рэгулюецца напісанне вызначаных арфаграм.

1. *Важнасць смеху не памеха.* 2. *Б'юць і за тое, што перакруціў, і за тое, што недакруціў.* 3. *Не паставіўшы хату, печ не кладуць.* 4. *Ніхто двойчы не нараджаецца.* 5. *Ні швец, ні жнец, ні дратвы канец.*

Разважанне на лінгвістычную тэму з выкарыстаннем навуковых тэрмінаў будзе садзейнічаць развіццю навуковага мыслення і маўлення, уменню вызначаць арфаграмы і абгрунтоўваць свой выбар. Гутарка па змесце прыказак і прымавак паспрыяе засваенню культурнай спадчыны беларусаў, дасць магчымасць засяродзіцца на адметнасці светаўспрымання нашых продкаў.

На матэрыяле наступнага практыкавання арганізуецца самастойная пошукавая дзейнасць, падчас якой удасканальваецца уменне вызначаць месцы магчымых памылак пры напісанні *не (ня), ні*, развіваецца арфаграфічная пільнасць.

Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс. Назавіце арфаграмы, пры напісанні якіх вы маглі б памыліцца.

1. *Не маё гарыць, не мне і тушыць.* 2. *Дзе два раты кормяцца, там і трэці не лішні.* 3. *Не іголка вінавата, калі кажух цесны.* 4. *Ні шые ні пора.*

Развіццё ўмення дыферэнцыраваць з'явы, выбіраць правільны варыянт напісання арфаграмы арганізуецца на матэрыяле практыкаванняў, што прадугледжваюць заданні на выбар ці размеркаванне моўнага матэрыялу. У ходзе такой працы выкарыстоўваецца прыём параўнання, які дапамагае мабілізаваць увагу, з'яўляецца асновай для асэнсаванага і лагічна правільнага прымянення правіла на практыцы. У якасці такіх практыкаванняў можна выкарыстаць наступныя:

1. Паслухайце прыказкі і прымаўкі. З прачытаных сказаў выпішыце тыя, у якіх *не* са словамі пішацца асобна. Абгрунтуйце свой выбар.

1. *На няшчаснага жабрака ўсе сабакі брэшуць.* 2. *Сіла не заўсёды сябруе з праўдай.* 3. *Недаскочыш – бяда і пераскочыш – бяда.* 4. *Не так дарагая гусь, як яе пер'е.* 5. *На паляванні аднаму ўдача, а другому – незадача.*

2. Прачытайце прыказкі і прымаўкі. Асобна выпішыце сказы, у якіх пішацца ***не*** і ***ні***. Вызначце, якога чалавека можна ахарактарызаваць пры дапамозе апошняй прыказкі.

1. *Ён і з агню выскачыць не абгарэўшы.* 2. *На каго валіць куль саломы, а на сябе – ні вецця.* 3. *Калі не навучыў бацька, то навучаць людзі.* 5. *Свой не свой, а на дарозе не стой.* 6. *Ні сокал, ні варона.*

3. Спішыце, раскрываючы дужкі. Растлумачце напісанне ***не (ня), ні***. Выберыце найбольш цікавую для вас прыказку і пісьмова растлумачце яе сэнс.

1. *Колькі свінню (ні)кармі – яна ўсё роўна будзе рохкаць.* 2. *(Ні)кому як удаве Агаце: пуста і ў хляве, пуста і ў хаце.* 3. *Вучоны водзіць, а (не)вучоны следам ходзіць.* 4. *(Не)сплёўшы новыя лапці, старыя (не)выкідай.* 5. *Я (не)людзі, але і Хама (не)чалавек.* 6. *З (ні)чога (ні)чога не бывае.*

Заданне на параўнанне і супастаўленне падобных арфаграм, абгрунтаванне выбару іх напісання дазволіць высветліць, наколькі паслядоўнымі і лагічнымі з'яўляюцца дзеянні вучня падчас прымянення правіла на практыцы. Абгрунтаванне выбару напісання арфаграмы будзе не толькі садзейнічаць развіццю лінгвістычнага мыслення, удасканаленню ўмення праводзіць лагічныя паралелі, рабіць вывады і абагульненні, але і паспрыяе развіццю навуковага маўлення, моўнага чуцця і арфаграфічнай пільнасці.

Падчас выканання прапанаваных для развіцця арфаграфічных уменняў і навыкаў рэпрадуктыўных практыкаванняў вучні ўспрымаюць арфаграмы на слых; знаходзяць іх ў словах з парэмій, кваліфікуюць і суадносяць з правілам; вызначаюць семантычныя, фанетычныя, граматычныя, словаўтваральныя прыметы, ад якіх залежыць правільнае напісанне; класіфікуюць арфаграмы, абгрунтоўваюць выбар напісання і інш.

На наступным этапе навучання прапануюцца практыкаванні творчага характару, якія дапамогуць замацаваць набытыя ўменні і навыкі і ўдасканаліць іх падчас маўленчай практыкі. Да такіх практыкаванняў можна аднесці выпісванне парэмій з вывучанай арфаграмай са слоўнікаў і мастацкіх твораў, творчыя дыктанты, абагульненне лінгвістычнага матэрыялу ў выглядзе плана паведамлення на лінгвістычную тэму і складанне такога паведамлення, пісьмовыя адказы на пытанні, напісанне сачынення і інш.

У якасці дыдактычнага матэрыялу на гэтым этапе могуць быць выкарыстаны наступныя практыкаванні:

1. Запішыце сказы, устаўляючы ў словы прапушчаныя літары. Пісьмова патлумачце, чаму вы выбралі менавіта такі варыянт напісання.

1. *Няма сілы, дык і свет н…мілы*. 2. *Колькі злодзей н… крадзе – усё роўна пападзецца. 3. Воўк н… пастух, а свіння н... агародніца*. 4. *Н… набіўшы сінякоў, хадзіць н… навучышся*. 6. *Старцу пажар н… страшны.*

2. Складзіце план і падрыхтуйце паведамленне на тэму «*Напісанне **не (ня), ні** з рознымі часцінамі мовы*».

3. Выпішыце са зборнікаў парэмій прыказкі і прымаўкі на тэму «Праца», у якіх макісмальна будзе пададзена вывучаная арфаграма. На выпісаным вамі матэрыяле прадэманструйце нацыянальныя асаблівасці стаўлення беларускага народа да працы.

З мэтай пацвярджэння значнасці праведзенай работы адабраныя вучнямі прыказкі і прымаўкі могуць быць эфектыўна выкарыстаны пры правядзенні дыктантаў (выбарачнага, каменціраванага, папераджальнага, тлумачальнага, дыктанта “Правяраю сябе” і інш.), гутарак пра духоўную спадчыну беларусаў. Такая работа будзе садзейнічаць развіццю арфаграфічных уменняў і навыкаў, пашырэнню ведаў пра нацыянальную культуру нашага народа.

Заданні на ўзнаўленне прыказак і прымавак таксама паспрыяюць вырашэнню задачы развіцця арфаграфічных уменняў і навыкаў вучняў:

1. Дапішыце прыказкі і прымаўкі на тэму «Шчасце». Растлумачце напісанне ***не (ня), ні*** і пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах. У чым, на вашу думку, беларус бачыць сваё шчасце і ад чаго яно залежыць? Запішыце некалькі

прыказак на прапанаваную тэму. Растлумачце напісанне вывучанай арфаграмы.

1. *Аднаму шчасце ракою плыве…* 2. *Хто не мае шчасця зранку…* 3. *Шчасце не конь…* 4. *Нешчаслівы ад шчасця…* 5. *На чужое шчасце…*6. *Нічые такія слёзы, як матчыны…*

*Матэрыял для даведкі*: …у аглоблі не ўпражэш; …яны і ўтопяць, яны і шчасця выпрасяць; …уцякае; …той не мае і да вечара; …а другі ў няшчасці цэлы век жыве; …не мухаю пасці.

2. Дапішыце прыказкі, пашыраючы іх словамі з ***не (ня), ні***. Абгрунтуйце напісанне.

1. *Чужы рот – не агарод: плотам…* 2. *Размоў многа, а справы …*3. *Рана ад нажа загоіцца, а ад злога слова…* 4. *Высокі тын абароніць хату ад злодзея, а не ад….* 5. *Добры той госць, які гасцюе…* 6. *Слова міма …*

Выяўленне ў прыказках і прымаўках арфаграфічных памылак, абгрунтаванне правільнага выбару арфаграмы з’яўляецца неад’емнай часткай работы па развіцці арфаграфічных уменняў і навыкаў. Таму ў сістэму практыкаванняў мэтазгодна ўключаць такія віды заданняў, як узаемаправерка вучнёўскіх работ, рэдагаванне няправільных напісанняў і інш.

Такім чынам, работа па развіцці арфаграфічных уменняў і навыкаў на матэрыяле прыказак і прымавак будзе эфектыўнай, калі яна арганізавана з увагай да аперацыйнай дзейнасці вучняў і рэалізуецца на аснове комплексу практыкаванняў, што скіроўваюць вучняў не толькі на аналітыка-сінтэтычную, але і на прадуктыўную дзейнасць.

Літаратура:

1. Булохов В. Я. Поле орфограммы и его роль в формировании правописной компетенции / В. Я. Булохов // Русский язык в школе. – 2010. – № 8. – С. 30 – 34.

2. Лаури Н. М. Алгоритмы по орфографии / Н. М. Лаури // Русский язык в школе. – 2005. – № 4. – С. 26 – 32.